Генадзь Семянчук: чалавек — стварэнне гістарычнае: інтэрв'ю з гісторыкам, археолагам Г.Семенчуком.- Рэжым доступу: http://volkovysk.by/society/genadz-semyanchuk-chalavek-stvarenne-gistarychnae.html.- 19.01.2015. – на бел. мове.- фота.



**Генадзь Мікалаевіч СЕМЯНЧУК** *(6.10.1963 г., Ваўкавыск): беларускі археолаг, гісторык. Кандыдат гістарычных навук (1993), дацэнт.*

*Скончыў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы (1985), аспірантуру па спецыяльнасці «Археалогія» (пад кіраўніцтвам Г. Штыхава) Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1990).*

*Асноўныя тэмы даследаванняў: палітычная і сацыяльная гісторыя Беларусі 6—16 ст., археалогія сярэднявечнага перыяду Беларусі, культура Гродзенскага рэгіёну (пераважна горадабудаўніцтва, культавая і свецкая архітэктура.*

*Працы:*

*«Фарміраванне і развіццё тэрыторыі Полацкай зямлі ў IX — першай палове XIII стст.», кандыдацкая дысертацыя (1993).*

*Археалогія Беларусі. У 2-х частках. Навучальны дапаможнік для студэнтаў па спецыяльнасці «Гісторыя». — Гродна 1996. Частка 1. — Ад палеаліта да ранняга сярэднявечча. — 137 с. (разам С.Піваварчыкам).*

*Археалогія Беларусі. У 2-х частках. Навучальны дапаможнік для студэнтаў па спецыяльнасці «Гісторыя». — Гродна 1997. Частка 2. — Эпоха сярэднявечча. — 191 с. (разам С.Піваварчыкам).*

Сярод людзей, якія нарадзіліся у Ваўкавыску, ёсць шмат цікавых і творчых людзей. Ёсць тыя, што з'ехалі з Ваўкавышчыны і забылі пра свой горад, а ёсць людзі, якія робяць шмат добрых спраў для малой радзімы. Адзін з апошніх — Генадзь Семянчук, навукоўца, археолаг, дацэнт катэдры археалогіі і этналогііГродзенскага дзяржаўнага універсітэту. Амаль кожны год ён прыязджае на Ваўкавышчыну з археалагічнымі раскопкамі, акрамя таго чытае лекцыі ў нашым каледжы, дзе мы з ім і сустрэліся.

**- Дзень добры, спадар Генадзь, дзякуй Вам за тое, што шмат часу аддаеце гісторыі Ваўкавышчыны і за тое, што знайшлі хвіліну, каб паразмаўляць на калягістарычныя тэмы. Мы ведаем, што Вы маеце нейкае дачыненне да лёсу падароскай сядзібы, якую набыў расейскі бізнэсоўца. Ці так гэта?**

- Так, я буду супрацоўнічаць з Паўлам над ягоным праектам і менавіта сёння еду ў БТІ за дакументамі на сядзібу. З гэтага часу Павел Падкарытаў паўнаўласны гаспадар. Ён будуе вялікія планы.

**- Асоба Паўла Падкарытнага і сядзіба ў Падароску варты асобнага артыкула, які ў хуткім часе з'явіцца на старонках сайта, думаю, і з Вашым удзелам, як навуковага кансультанта. Мы ведаем, што Вы нарадзіліся ў Ваўкавыску і менавіта таму Ваўкавшчына ўваходзіць у кола Вашых гістарычных інтэрэсаў. Калі браць гісторыю рэгіёна ў глабальным сэнсе — наколькі добра яна вядома, ці ёсць невывучаныя старонкі?**

- Натуральна. Самым слабым месцам у гісторыі Ваўкавышчыны з'яўляецца, як ні парадаксальна, перыяд Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Першая прычына гэта тое, што ніхто фундаментальна пакуль гэтым перыядам не займаўся, пры гэтым крыніцазнаўчая база, асабліва з 16 ст. дазваляе «выкалупваць» нейкія факты. Нешта было надрукавана у 19 ст., нешта у 20 ст., а нешта ляжыць у архівах. Літаральна нядаўна ў Варшаве мне пашанцавала прачытаць гістарычныя дакументы 15-16 ст. адносна Поразава, што раней адносілася да Ваўкавыскага павета. Шмат дакументаў і кніг знаходзіцца ў Мінскам архіве, гэта бумагі, якія датычацца жыцця людзей таго часу

— купля-продаж маёмасці, судовыя і крымінальныя справы. Шмат дакументаў панішчылі войны, але яны ёсць. У Віленскім архіве ёсць метрычныя кніжкі Ваўкавыскага касцёлу з 20-х гадоў 18 ст., па якіх можна адсочваць гісторыі сямей да нашых часоў. Не вывучана структура і дзейнасць Ваўкавыскага сейміка, які былі створаны ў 60-70 гг. 16 стагоддзя і працаваў да падзелу Рэчы Паспалітай, тут варта ўжо падключаць маіх студэнтаў гістарычнага факультэту.
Папярэдняя гістарычная эпоха рэгіёну больш складаная, таму што не засталося пісьмовых крыніц, тут можна займацца толькі рэканструкцыяй з дапамогай археалогіі, можна нешта знайсці ў дакументах, якія датычацца ўзаемадносін ВКЛ і Крыжацкага ордэна, дзе раз ад разу ўзгадваецца Ваўкавыск. Лепш за ўсё вывучана гісторыя 19 і 20 ст., тут і Кніга Памяці, і працы Мікалая Быхаўцава.

**- Спадар Генадзь, калі паглядзець на гістарычныя даты, якія адзначаюцца ў нашым горадзе, то ўсе яны датычацца толькі Савецкага перыяду, іншых дат няма. Чаму так?**

- Адказ вельмі просты — нажаль, да сённяшняга дня мы знаходзімся ў палоне распрацаваных ідэялагічных схемаў, распрацаваных у Савецкім Саюзе, якія былі скіраваны толькі на ўзмацненне ўлады Камуністычнай партыі, а ў той ідэалогіі ўсе, што адбывалася да бальшавікоў — шкоднае. Нажаль, мы маем і другую тэндэнцыю, цяпер даволі актыўна ўводзяцца расейкія імперскія традыцыі, гістарычныя рамкі сучаснай ідэалогіі пашырыліся да межаў існавання ў нас Расейскай імперыі. Гэта ўсё прыклад несфармаванай гістарычнай палітыкі ў дзяржаве.

**- А гэта палітыка патрэбна?**

- Абсалютна патрэбна. Чалавек — гэта стварэнне гістарычнае, чалавек без гісторыі ператвараецца ў жывёлу. На гэтай зямлі адбываліся розныя гістарычныя падзеі — і дрэнныя, і добрыя, і вакол іх павінна быць дыскусія, і не толькі навукоўцаў, але і звычайных грамадзян. Пра ўсе падзеі трэба памятаць, таму разам з вуліцай Леніна павінна быць вуліца Кастуся Каліноўскага і вуліца Льва Сапегі.

**- Як вы лічыце, ці адбудзецца абуджэнне гістарычнай самасвядомасці і беларускай мовы сярод жыхароў Беларусі?**

- Калі я пачынаў выкладаць гісторыю на беларускай мове ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, шмат студэнтаў мне казалі: «А нельзя ли по-русски, я не понимаю?» Цяпер такога няма, усе разумеюць. Калі на Каляды я напісаў ліст свайму сябру Алесю Бяляцкаму, каб яго падтрымаць, ён адказаў мне, што калі мы пазнаёміліся ў Міры ў 1983 годзе — нас была невялічкая кучка маладых рамантыкаў, а зараз мы ўжо сіла, нас баяцца. Нават, прыклад Паўла Падкарытнага, які вывучыў беларускаю мову, набыў падароскую сядзібу, дае мне аптымізм у тым, што ўсё будзе добра.
БССР была самая абрусеўшая рэспубліка ў складзе СССР, таму павінны прайсці пэўныя гістарычныя працэсы.

**- А патрэбна вяртанне да мовы і да самастойнасці? Ну, размаўлем па-руску — Расея вялікі ўсходні сусед, добра адчуваць часткай вялікага.**

- Можна размаўляць і на рускай мове, але трэба быць патрыётам, таму што праз некаторы час мы раптам станем жыхарамі расейскай губерні. Калі б усе людзі разважалі так — то мы ўжо былі б часткай РФ, але штосьці не дае нам, карані цягнуць да сябе. Падставай аптымізму я лічу і тое, што Прэзідэнт Беларусі наўрад ці захоча стаць расейскім губернатарам.
Кожнае новае пакаленне, хай сабе с цяжкасцямі, але робіцца больш патрыятычным. Цягу да гісторыі, мовы, культуры я адчуваю і сярод сваіх студэнтаў, таму будзем жыць і ўсё ў нас будзе добра.

**- Спадар Генадзь, як вы ставіцеся да асобы Каліноўскага? Зарас існуе шмат пазіцый, святары кажуць, што Каліноўскі гэта антыгерой, ён уводзіў уніяцтва, а Мураўёў — герой, ён пабудаваў храмы, для апазіцыі — Каліноўскі безумоўны герой, палякі кажуць, што ў Каліноўскага не было аніякай беларускай ідэі і ён чыста польскі паўстанец. Гледзячы на тое, што аппазіцыя ўзняла вобраз Каліноўскага, дзяржава ад яго стала адмаўляцца. Чый бок займеце Вы?**

- Асоба Каліноўскага супярэчлівая, але той, хто змагаецца супраць акупантаў і супраць прыгона годны ўшанавання. Кожны з бакоў дыскутуе пра свае ідэі, а не пра асобу Кастуся як гістарычнай падзеі. Каб спрэчацца па гэтаму пытанню, трэба мець тэксты біяграфіі Каліноўскага, якія напішуць гісторыкі розных бакоў, а іх пакуль няма.  Калі з’явіцца біяграфія на 500 старонак, з дакументамі і фактамі, толькі тады можна будзе даць адэкватную адзнаку асобы, пакуль жа кожны прасоўвае сваю ідэалогію.

**- Спадар Генадзь, у нас ёсць шмат чытачоў, таму ў Вас ёсць шанец звярнуцца да землякоў. Якія словы Вы скажаце сваім землякам?**

- У першаю чаргу, трэба навучыцца паважаць саміх сябе, паважаць і выхоўваць у сабе гонар за месца, дзе мы жывем, калі мы будзем маць гэты гонар, тады мы будзем дбаць пра багацце, чысціню і ўтульнасць Ваўкавышчыны ўвогуле, а не толькі пра асабісты падворак.
Па другое, я хачу пажадаць ваўкавычанам смеласці і аптымізму і яшчэ я хачу пажадаць ваўкавычанам актыўнасці ў культурным і грамадскім жыцці, самастойнасці.
Здымкі 2009 года з раскопак на Шведскай гары


Волковыск.BY


Волковыск.BY


Волковыск.BY


Волковыск.BY